Весці БДПУ. Серыя 1. 2024. № 4. С. 135–139

УДК 821.161.3:82.09

# ФЕНОМЕН ІНТЭРМЕДЫЯЛЬНАСЦІ Ў МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

**У. А. Ліпніцкая,**
*аспірант кафедры беларускай і замежнай літаратуры Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*
*ORCID: https://orcid.org/0009-0004-4874-3708*

Паступіў у рэдакцыю 14.10.2024.

УДК 821.161.3:82.09

# THE PHENOMENON OF INTERMEDIALITY IN FICTION

**U. Lipnitskaya,**
*postgraduate student of the Department of Belarusian and Foreign Literature of the Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank*
*ORCID: https://orcid.org/0009-0004-4874-3708*

Received on 14.10.2024.

На ранніх этапах развіцця мастацтва характарызавалася высокай ступенню еднасці, аднак, набыўшы «самастойнасць», музыка, літаратура і жывапіс сталі прэтэндаваць на незалежнасць сродкаў выражэння, форм і метадаў уздзеяння. Праблема ізаляванасці і ўзаемадзеяння розных мастацтваў з'яўляецца значнай для даследчыкаў. У артыкуле выяўляюцца перадумовы развіцця феномену інтэрмедыяльнасці, даследуюцца асаблівасці рэпрэзентацыі дадзенага феномену на прыкладзе класіфікацый, прапанаваных Й. Шротэрам, В. Вольфам, О. Хансэн-Лёвэ, Н. Цішунінай, А. Цімашковым, Я. Гарадніцкім, абгрунтоўваюцца прынцыпы тыпалогіі інтэрмедыяльных адносін у мастацкай літаратуры праз прызму замежных і айчынных класіфікацый узаемадзеяння розных кодаў.

*Ключавыя словы:* інтэрмедыяльнасць, віды інтэрмедыяльнасці, вербальнае і візуальнае, міжмастацкія ўзаемадзеянні.

In the early stages of development, art was characterized by a high degree of unity, however, acquiring "independence", music, literature and painting began to claim the independence of means of expression, forms and methods of influence. The problem of isolation and interaction between different arts is significant for researchers. The article reveals the background to the development of the phenomenon of intermediality, and examines the features of the presentation of this phenomenon using the example of classifications proposed by Y. Schroeter, V. Wolf, O. Hansen-Leuve, N. Tishunina, A. Timashkov, I. Horodnitsky, he principles of the typology of intermedial relations in fiction are substantiated through the prism of foreign and domestic classifications of the interaction of different codes.

*Keywords:* intermediality, types of intermediality, verbal and visual, interartistic interactions.

У апошнія дзесяцігоддзі навукоўцы актыўна шукаюць найважнейшую дамінантную характарыстыку, якая магла б стаць цэнтрам інтэграцыі ўсіх разнастайных і разнапланавых з'яў літаратуры. Гэта тая агульная характарыстыка, якая дазволіць казаць як аб унутраным адзінстве літаратуры, так і аб яе адзінстве з іншымі мастацтвамі. Літаратура так ці інакш звязана з іншымі мастацтвамі. З аднаго боку, гэта тыпалагічная сувязь, якая прадугледжвае агульны характар эстэтычнай дзейнасці асобы. З іншага боку, гэтыя сувязі ўзмацняюцца тым, што творы іншых відаў мастацтва і розныя аспекты творчага працэсу гэтых відаў увасабляюцца ў літаратурных творах. У літаратуры, як і ва ўсіх іншых відах мастацтва, рабіліся шматлікія спробы выявіць асноўныя функцыянальныя асаблівасці, якія маглі б растлумачыць сутнасць гэтай з'явы.

Праблема адасобленасці розных відаў мастацтва, правамернасці разгляду іх як ізаляваных, а таксама магчымасці іх сінтэзу або выкарыстання аднымі відамі мастацтваў уласцівасцей іншых застаецца адной з самых актуальных, як для літаратуразнаўства, так і для культуралогіі. Распрацоўку гэтай праблемы можна знайсці і ў Антычнасці, і ў эстэтыцы эпохі Адраджэння, і ў класіцызме, дзе яна ставілася пераважна як праблема жанраў, і ў эстэтыцы асветнікаў. Калі эпоха Адраджэння характарызавалася своеасаблівай «канкурэнцыяй» мастацкай літаратуры і пластычных мастацтваў, то даследаванні рамантыкаў сталі новым этапам у разуменні праблемы інтэграцыі мастацтваў і магчымасцяў іх прадуктыўнага ўзаемадзеяння. Літаратура эпохі рамантызму ўступіла ў больш цеснае ўзаемадзеянне з іншымі мастацтвамі.

У той жа час сярод усёй разнастайнасці відаў мастацтва можна вылучыць некалькі асноўных, з якімі ў літаратуры гістарычна найбольш цесная сувязь. Гэта наперш музыка і выяўленчае мастацтва. Музыка з самай глыбокай старажытнасці суправаджала слова, надаючы яму дадатковыя мастацкія адценні. Сувязь гучання і сэнсу абумоўліваецца сама прырода вербальнага выказвання. Музычны аспект у фанетычным і рытміка-інтанацыйным афармленні літаратурнага дыскурсу адыгрывае вельмі істотную ролю, што асабліва заўважаецца ў паэзіі.

З XIX – пачатку XX ст. мяняецца стаўленне да адасобленасці відаў мастацтва і робяцца практычныя спробы іх сінтэзу. Асобная ўвага адводзіцца ўзаемадзеянню музыкі і слова, а значнымі фігурамі ў распрацоўцы пытання аб узаемадзеянні становяцца кампазітары. Р. Вагнер сваёй опернай рэформай паставіў пытанне аб прынцыповых асновах сінтэзу мастацтваў, што паслужыла яскравым прыкладам распрацоўкі праблем сінтэзу мастацтваў у тэарэтычным і практычным ключы. Мастацтвазнаўца В. Ванслаў у манаграфіі «Эстетика романтизма»

адзначаў: «Не стремясь специально к расширению средств музыкальной выразительности, – писал Вагнер, – я тем не менее не мог не способствовать этому введением в кругозор музыки тех предметов, для которых я искал отражения в звуках» [1, 250]. Уплыў жывапісу, паэзіі ці тэатра на музыку канстатуецца кампазітарам як плённасць і ўзбагачэнне ўсіх згаданых відаў мастацтва. Гэта праяўляецца ў асацыятыўна-карціннай нагляднасці музычнага твора, ва ўвасабленні паэтычнага сюжэту, у раскрыцці драматычнага дзеяння. У сваю чаргу ўплыў музыкі на літаратуру знаходзіць свой выраз у агульнай тэндэнцыі да лірызацыі літаратуры, насычэнні паэзіі музычнасцю рытмаў і інтанацый, трансфармацыі аднаго мастацтва ў іншае. Той факт, што ніколі ў папярэднія эпохі не было створана столькі музычных твораў, звязаных з мастацкай літаратурай, як у эпоху рамантызму, таксама спрыяе інтэграцыі музыкі і літаратуры.

Зблiжае лiтаратуру i выяўленчае мастацтва пейзажыстыка, якая ў лiтаратуры знайшла выражэнне вербальнымі сродкамі. Так, на думку мастацтвазнаўцы В. Ванслава, «описаниям Гофмана, например, свойственна необычайная “вещественность”, предметная конкретность, которая, несомненно, идет от его живописного мышления. Внешность человека, его костюм, жилье, окружающую обстановку Гофман описывает так, словно он рассказывает картину, оставаясь в то же время верным специфически литературной художественности. Недаром некоторые его литературные картины имеют свои реальные живописные прообразы. Так, описание работы мастерской в рассказе “Мартин-бочар” Гофман сделал в точном соответствии с картиной художника Кольбе “Бочарная мастерская”. А один из замечательных циклов своих повестей, новелл и рассказов Гофман называет “Фантастические отрывки в манере Калло”. Сближая свои произведения с творчеством Калло – французского художника-графика начала XVII века, – Гофман не только подчеркивает общность двух искусств, но и указывает на явления живописи как на один из истоков своей литературной образности» [1, с. 283]. Музыка і жывапіс не толькі ўзбагачаюць літаратуру, але і адчуваюць на сабе яе ўплыў. Музыка пачынае імкнуцца да сюжэтнасці, з аднаго боку, карціннасці – з другога.

Такім чынам, мы бачым, што мастацкі тэкст – гэта складаная, шматслаёвая структура. Задача даследчыкаў – зразумець закладзены аўтарам сэнс, спазнаць глыбінную сутнасць мастацкага твора. А феномен інтермедыяльнасці[1] ўзнікае як вынік ускладнення прынцыпаў арганізацыі літаратурнага твора, які асімілюе пэўныя асаблівасці твораў іншых відаў мастацтва.

Нягледзячы на ўсплёск навуковай цікавасці да паняцця «інтэрмедыяльнасці»,назіраецца і тэрміналагічная варыятыўнасць у абазначэнні міжмастацкіх узаемадзеянняў. «Фактычна кожны даследчык прапаноўвае і ўласную тыпалогію інтэрмедыяльных узаемадзеянняў», – адзначае М. Тычына [2, с. 449]. Напрыклад, інтэрмедыяльныя сувязі (Р. Брузгенэ) [3], інтэрмедыятывы (І. Драч) [4], кампаненты інтэрмедыяльнага парадку (К. Паўлава) [5], інтэрмедыяліі (А. Хамінава) [6], інтэрмедыяльныя карэляцыі (А. Каркавіна) [7], інтэрмедыяльныя коды (Г. Сідарава) [8], інтэрмедыяльныя маркёры (В. Мысліва) [9], інтэрмедыяльныя інкарпарацыі (І. Пагарэлава) [10], інтэракцыі (Л. Генералюк) [11]. Але важна адзначыць, што інтэрмедыяльнасць – гэта не толькі **спосаб арганізацыі** мастацкага тэксту, але і спецыфічная **метадалогія аналізу** мастацкага твора.

Разгледзім найбольш значныя навуковыя класіфікацыі міжмастацкіх узаемадзеянняў. Нямецкі славіст О. Хансэн-Лёвэ ўвёў тэрмін «інтэрмедыяльнасць» у 1983 г. і распрацаваў некалькі інтэрмедыяльных тыпалогій, сярод якіх «літаратурна-жывапісная» класіфікацыя. «За концепцией интермедиальности стоит общекультурное стремление к обмену, смешиванию, гибридизации, присущее любым тенденциям интертекстуальности, междисциплинарности, межкультурности», – адзначае аўтар [12, с. 22]. Навуковец вылучае тры значэнні інтэрмедыяльнасці: 1) **канвенцыйная** – наяўнасць у аднаго медыя характэрных уласцівасцей другога; 2) **нарматыўная** – выкарыстанне аднаго сюжэту рознымі медыя; 3) **рэферэнцыйная** – цытаванне тэксту аднаго медыя ў тэксце іншага.

Кажучы пра сувязь музыкі і літарaратуры трэба ўзгадаць працу Вернера Вольфа «Intermediality Revisited: Reflections on Word and Music Relations in the Context of a General Typology of Intermediality» (2002 г.). У сваім даследаванні ён падзяляе інтэрмедыяльнасць на дзве вялікія групы:

1) **экстракампазіцыйная** – шырокае разуменне інтэрмедыяльнасці. У гэту групу ўвайшлі трансмедыяльнасць (напрыклад, наратыўнасць музыкі і літаратуры) і інтэрмедыяльная транспазіцыя (напрыклад, перанос навелы ў оперу) [13, с. 14–16];
2) **інтракампазіцыйная** – вузкае разуменне інтэрмедыяльнасці. Да другой групы В. Вольф аднасіць інтэрмедыяльную рэферэнцыю, якая прадугледжвае выкарыстанне адной семіятычнай сістэмы (напрыклад, музычнасць літаратурнага твора, дыскусіі аб музыцы ў літаратуры) і плюральную медыяльнасць, якая выкарыстоўвае больш за адну семіятычную сістэму (напрыклад, выкананне оперы, тэкставая аснова оперы) [13, с. 17–19].

[1] Інтермедыяльнасць (англ.: inter + media/art = intermedia/interart) у яго самым шырокім значэнні адносіцца да любых узаемадзеянняў паміж рознымі медыя і, такім чынам, выкарыстоўваецца для апісання значнай колькасці культурных феноменаў.

Дадзеная класіфікацыя была створана В. Вольфам для музычных твораў і змяшчае дэталёвы агляд разнастайных модусаў музыкі (лібрэта, выкананне оперы, згадка музыкі ў літаратуры) з ўлікам спецыфікі канкрэтнага віду мастацтва. Але трэба адзначыць, што на сённяшні дзень шэраг даследчыкаў (Р. Брузгенэ, В. Шыкірынска, А. Каркавіна, М. Васілеўска-Хмура, А. Хамінава) ўзбагацілі і адаптавалі канцэпцыю В. Вольфа. Распрацаваная навукоўцамі класіфікацыя тыпаў інтэрмедыяльнасці стала прыдатнай не толькі для музычна-літаратурных узаемадзеянняў, але і для вербальна-візуальных карэляцый.

Адзін з найбольш шырокіх падыходаў прадстаўлены ў даследаванні Й. Шротэра “Intermedialität. Facetten und Probleme eines aktuellen medienwissenschaftlichen Begriffes”, які вызначае тэрмін «медыя» як знакавую сістэму, код. Ён вылучае чатыры віды інтэрмедыяльнасці:

1) **сінтэтычная** – працэс зліцця некалькіх медыя ў якасна новае медыя, гэта значыць сукупнасць асобных медыя прывядзе да стварэння нейкага адзінства;
2) **трансмедыяльная ці фармальная** інтэрмедыяльнасць мае на ўвазе наяўнасць агульных матываў, элементаў, тэм у розных медыя, выкарыстанне іх у разнастайных медыяльных асяроддзях. Так, напрыклад, у імпрэсіянізме, на фотаздымку і ў кінематографе прасочваецца агульны «рэжым» выявы. Карціны, фотаздымкі, коміксы ўтрымоўваюць агульныя элементы: суадносіны кадраў у кадры, вугла, вышыні, узроўня і адлегласці да кропкі агляду, пры гэтым кожны з відаў мастацтва валодае спецыфічнымі характарыстыкамі. Прыкладам гэтага віду інтэрмедыяльнасці можа служыць і выкарыстанне аднаго сюжэту ў розных медыяльных асяроддзях, зварот да тэм іншых твораў мастацтва, увасабленне аднаго і таго ж сюжэту ў розных відах мастацтва. Некаторыя даследчыкі адзначаюць, што ў дадзеным выпадку інтэрмедыяльным будзе хутчэй падыход да ўзаемадзеяння розных медыяў, а не сама з’ява ўзаемадзеяння. Але адзначым, што адзін і той жа матыў, тэма могуць разглядацца не толькі рознымі відамі мастацтваў, але і аўтарамі розных эпох;
3) сутнасць **трансфармацыйнай** заключаецца ў працэсе «трансфармацыі», пераводу з адной знакавай сістэмы ў іншую. Й. Шротэр прыводзіць у якасці прыкладу карціну ў фільме або будынак на фотаздымку, якія з’яўляюцца ўжо не карцінай і не будынкам, а нead’емнай часткай асяроддзя, якую яны прадстаўляюць;
4) **анталагічная** заснавана на выяўленні «анталагічных», першапачатковых уласцівасцяў канкрэтнага медыя, якія раскрываюць яго сутнасць, і выкарыстанні гэтых уласцівасцяў іншымі медыя. Пра гэты від інтэрмедыяльнасці можна казаць, калі адзін від мастацтва змяшчае структуры або «магчымасці» іншага [14].

Прапанаваныя Й. Шротэрам віды інтэрмедыяльнасці выклікалі спрэчкі ў навуковым асяроддзі. Некаторыя даследчыкі мяркуюць, што пры такім тлумачэнні гаворка ідзе не пра ўзаемапранікненне мастацтваў, а пра спецыфічныя асаблівасці пэўнага віду мастацтва і, такім чынам, у дадзеным значэнні інтэрмедыяльнасць не можа быць вылучана як від. Паводле нашай думкі, гэты від інтэрмедыяльнасці можна таксама прызнаць інтэрмедыяльнасцю з некаторымі агаворкамі: справа не ў асаблівасцях якога-небудзь мастацтва, а ў тым, што пры такім узаемадзеянні адно мастацтва выкарыстоўвае метады, прыёмы іншага. Такім чынам, да прыкладу, раман не проста вылучаецца кінематаграфічнасцю сам па сабе, ён становіцца такім дзякуючы свядомаму выкарыстанню прыёмаў кінематографа аўтарам. Наяўнасць агульных рыс у розных відаў мастацтва з’яўляецца не іх «анталагічнай» уласцівасцю, а вынікам прымянення прыёмаў іншага мастацтва, якія «надзяляюць» яго гэтымі ўласцівасцямі. У дадзеным выпадку мы маем справу з «цытаваннем» не ўласна іншага віду мастацтва або яго часткі (карціны, кнігі, скульптуры і г. д.), а з выкарыстаннем адным відам мастацтва характэрных рыс іншага.

Своеасаблівы вынік спрэчкам вакол паняцця «інтэрмедыяльнасці» падводзіць Н. Цішуніна. Даследчыца ўказвае на магчымасць тлумачэння паняцця «інтэрмедыяльнасць» у шырокім і вузкім сэнсе. З яе пункту гледжання, *інтэрмедыяльнасць* можна вызначыць у вузкім сэнсе як «особый тип внутритекстовых взаимосвязей в художественном произведении, основанный на взаимодействии художественных кодов разных видов искусств», у шырокім – як «создание целостного полихудожественного пространства в системе культуры (или создание художественного «метаязыка» культуры)» [15, с. 153]. Н. Цішуніна ў адрозненні ад нямецкіх даследчыкаў прапануе разглядаць інтэрмедыяльнасць не толькі як спосаб арганізацыі твора, але і як метадалогію аналізу. У рамках інтэрмедыяльнага падыходу да аналізу тэкста важнымі сталі высновы пецярбургскага даследчыка А. Цімашкова. Акрамя таго, што мастацтвазнаўца перапрацаваў і адаптаваў шэраг класіфікацый інтэрмедыяльных узаемадзенняў, ён абазначае дзве магчымыя мадальнасці інтэрмедыяльнасці – «універсальны прынцып творчасці» і «аўтарская стратэгія, абумоўленая гістарычным развіццём мастацкай культуры» [16].

Беларускія даследчыкі таксама пачалі звяртаць увагу на праблему міжмастацкіх узаемадзеянняў праз прызму інтэрмедыяльнасці. Тут варта згадаць нацыянальнага даследчыка Я. Гарадніцкага, які ў сваёй манаграфіі разглядае мастацкую літаратуру ў трох навуковых дыскурсах: 1) камунікатыўнасць творчага працэсу; 2) інтэрмедыяльнасць як выяўленне тыпалагічнай блізкасці мастацтваў; 3) наратыўнасць як адзін з самых істотных спосабаў раскрыцця

змястоўна-фармальнай цэласнасці літаратурнага твора [17, с. 121].

Такім чынам, можна заўважыць, што ва ўсіх разгледжаных класіфікацыях навукоўцы шмат увагі надаюць сродкам выражэння аднаго кода (музыка, словы, выявы) і ўзроўню ўзаемадзеяння медыя. Значыць, каб выявіць пэўныя тыпалагічна-роднасныя рысы, характэрныя для розных відаў мастатва, неабходна звярнуць увагу на *матэрыял*, з якім працуе дадзены від мастацтва, *формы*, у якіх ён увасабляецца, *прадмет* як асноўны аб'ект, на якім факусіруецца ўвага ў творы.

Значыць можна вылучыць, на нашу думку, наступныя віды інтэрмедыяльнасці, рэлевантныя для мастацкага тэксту:

1) **рэферэнцыя** (адсылка, згадка іншага медыя ў мастацкім тэксце);
2) **трансфармацыя** (да гэтага віду інтэрмедыяльнасці можна аднесці ўсе прыклады аднаўлення аднаго віду мастацтва сродкамі іншага, якія спараджаюць узаемадзеянне на сэнсавым узроўні і маюць на ўвазе суаднясенне з канкрэтным відам мастацтва, яго асобнымі элементамі або вобразамі, у прыватнасці, экфрасіс (славеснае апісанне твораў мастацтва ў мастацкім тэксце), выява тэатра або апісанне танца ў літаратурным творы);
3) **мадыфікацыя** (змена меры ўспрымання медыя ў залежнасці ад чытання і кантэксту, вербальнае ўзнаўленне тэхнікі, кампазіцыі або формы твора з іншага віду мастацтва, напрыклад, змяшчэнне верша ў пэўным хранатопе, трансляцыя яго праз іншае медыя);
4) **сінтэз** (мадэляванне матэрыяльнай фактуры іншага віду мастацтва ў літаратуры, напрыклад, візуальная паэзія, саўнд-паэзія).

Акрамя тэарэтычных распрацовак існуе шырокае кола практычных даследаванняў, якія дазваляюць на падставе навуковых тэкстаў зрабіць высновы адносна тэарэтычных пазіцый інтэрмедыяльнасці. Шматлікія прыклады праяў інтэрмедыяльнасці ў літаратуры, кінематографе, жывапісе, якія прымаюць разнастайныя формы, становяцца пацвярджэннем значнасці з'явы для ўсяго літаратурнага і культурнага працэсу ў цэлым і для творчасці асобных аўтараў у прыватнасці. У сувязі з гэтым актуальным уяўляецца апрабацыя дадзенай тыпалогіі на канкрэтных творах з інтэрмедыяльнага пункту гледжання.

## Літаратура


1. *Ванслов, В. В.* Эстетика романтизма / В. В. Ванслов. – М. : Искусство, 1966. – 397 с.
2. Тэорыя літаратуры ў дыялогу еўрапейскіх культур / М. А. Тычына, Я. А. Гарадніцкі, Г. М. Кісліцына [і інш.]: навук. рэд. М. А. Тычына. – Мінск : Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т літаратуразнаўства імя Янкі Купалы, 2017. – 550 с.
3. *Брузгене, Р.* Литература и музыка: о классификациях взаимодействия / Р. Брузгене // Вестник Пермского университета. Российская и зарубежная филология. – 2009. – № 6. – С. 93–99.
4. *Драч, І. Д.* Інтермедіальні маркери в малій прозі Миколи Хвильового як ознака елітаризму / І. Д. Драч // Науковий вісник Волиньского національного університету імені Лесі Українки. Літературознавство. – 2009. – № 12. – С. 65–69.
5. *Павлова, Е. В.* Музыка в ранней прозе Томаса Манна: феномен интермедиальности : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.01.03 / Павлова Екатерина Владимировна ; Рос. гос. гуманитар. ун-т. – М., 2010. – 12 с.
6. *Хаминова, А. А.* Теория интермедиальности: проблемы и перспективы / А. А. Хаминова // Мова і культура. – 2012. – № 15, т. 7. – С. 373–379.
7. *Каркавина, О. В.* Языковая реализация интермедиальных отношений в творчестве Тони Моррисон : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.04 / Каркавина Оксана Владимировна ; Алт. гос. пед. акад. – Барнаул, 2011. – 19 с.
8. *Сидорова, А. Г.* Интермедиальная поэтика современной отечественной прозы: Литература, живопись, музыка : дис. ... канд. филол. наук : 10. 01. 01 / Сидорова Анна Геннадьевна ; Алт. гос. ун-т. – Барнаул, 2006. – 218 л.
9. *Мислива, В.* Інтермедіальне поле повісті «Я, Мілена» Оксани Забужко / В. Мислива // Літературний процес: методологія, імена, тенденції: зб. наук. пр. (Філол. науки) / Київ. ун-т ім. Б. Д. Грінченка ; редкол.: Є. О. Бондарева (гол. ред.), [та інш.]. – Київ, 2013. – С. 39–41.
10. *Погорелова, И. Ю.* Интермедиальность как художественная стратегия XXI века / И. Ю. Погорелова. – Пятигорск : Пятиг. гос. ун-т, 2014. – URL : http://www.pgu.ru/upload/iblock/914/uch_2014_vi_23.pdf (дата обращения: 01.10.2024).


## References


1. *Vanslov, V. V.* Estetika romantizma / V. V. Vanslov. – M. : Iskusstvo, 1966. – 397 s.
2. Teoryya litaratury ŭ dyyalogu eŭrapejskih kul'tur / M. A. Tychyna, Ya. A. Garadnicki, G. M. Kislicyna [i insh.]: navuk. red. M. A. Tychyna. – Minsk : Nac. akad. navuk Belarusi, In-t litaraturaznaŭstva imya Yanki Kupaly, 2017. – 550 s.
3. *Bruzgene, R.* Literatura i muzyka: o klassifikaciyah vzaimodejstviya / R. Bruzgene // Vestnik Permskogo universiteta. Rossijskaya i zarubezhnaya filologiya. – 2009. – № 6. – S. 93–99.
4. *Drach, I. D.* Intermedial'ni markeri v malij prozi Mikoli Hvil'ovogo yak oznaka elitarizmu / I. D. Drach // Naukovij visnik Volin'skogo nacional'nogo universitetu imeni Lesi Ukraïnki. Literaturoznavstvo. – 2009. – № 12. – S. 65–69.
5. *Pavlova, E. V.* Muzyka v rannej proze Tomasa Manna: fenomen intermedial'nosti : avtoref. dis. ... kand. filol. nauk : 10.01.03 / Pavlova Ekaterina Vladimirovna ; Ros. gos. gumanitar. un-t. – M., 2010. – 12 s.
6. *Haminova, A. A.* Teoriya intermedial'nosti: problemy i perspektivy / A. A. Haminova // Mova i kul'tura. – 2012. – № 15, t. 7. – S. 373–379.
7. *Karkavina, O. V.* Yazykovaya realizaciya intermedial'nyh otnoshenij v tvorchestve Toni Morrison : avtoref. dis. ... kand. filol. nauk : 10.02.04 / Karkavina Oksana Vladimirovna ; Alt. gos. ped. akad. – Barnaul, 2011. – 19 s.
8. *Sidorova, A. G.* Intermedial'naya poetika sovremennoj otechestvennoj prozy: Literatura, zhivopis', muzyka : dis. ... kand. filol. nauk : 10. 01. 01 / Sidorova Anna Gennad'evna ; Alt. gos. un-t. – Barnaul, 2006. – 218 l.
9. *Misliva, V.* Intermedial'ne pole povisti «Ya, Milena» Oksani Zabuzhko / V. Misliva // Literaturnij proces: metodologiya, imena, tendencii: zb. nauk. pr. (Filol. nauki) / Kiïv. un-t im. B. D. Grinchenka ; redkol.: Є. O. Bondareva (gol. red.), [ta insh.]. – Kiïv, 2013. – C. 39–41.
10. *Pogorelova, I. Yu.* Intermedial'nost' kak hudozhestvennaya strategiya HHI veka / I. Yu. Pogorelova. – Pyatigorsk : Pyatig. gos. un-t, 2014. – URL : http://www.pgu.ru/upload/iblock/914/uch_2014_vi_23.pdf (data obrashcheniya: 01.10.2024).

11. *Генералюк, Л.* Універсалізм Шевченка: Взаємодія літератури і мистецтва / Л. Генералюк. – К. : Наукова думка, 2008. – 544 с.
12. *Ханзен-Лёве Оге А.* Интермедиальность в русской культуре: от символизма к авангарду / Оге А. Ханзен-Лёве ; [пер. с нем. Б. М. Скуратова, Е. Ю. Смотрицкого]. – М. : Рос. гос. гум. ун-т, 2016. – 450 с .
13. WordPress : [bibliographic database]. – [Lisbon], 2014. – URL: https://cursointermidialidade.wordpress.com/wp-content/uploads/2014/08/wolf.pdf ( дата обращения: 24.09.2024).
14. *Хаминова, А. А.* Теория интермедиальности в контексте современной гуманитарной науки / А. А. Хаминова, Н. Н. Зильберман // Вестник Томского государственного университета. – 2014. – № 389. – С. 38–45.
15. *Тишунина, Н. В.* Методология интермедиального анализа в свете междисциплинарных исследований / Н. В Тишунина // Материалы международной научной конференции, Санкт-Петербург, 18 мая 2001 г. / С.-Петерб. гос. ун-т ; редкол.: Т. А. Дорохова (гл.ред.) [и др.]. – Санкт-Петербург, 2001. – С. 149–154.
16. *Тимашков, А. Ю.* Интермедиальность как авторская стратегия в европейской художественной культуре рубежа XIX – XX веков: автореф. дис. … канд. искусствовед.: 17.00.09 / Алексей Юрьевич Тимашков ; С.-Петерб. гум. ун-т проф-в. – Санкт-Петербург, 2012. – 24 с.
17. *Гарадніцкі, Я. А.* Літаратура як мастацтва: камунікатыўнасць, інтэрмедыяльнасць, наратыўнасць / Я. А. Гарадніцкі // Беларуская навука. – 2014. – С. 401.

11. *Generalyuk, L.* Universalizm Shevchenka: Vzaєmodiya literaturi i mistectva / L. Generalyuk. – K. : Naukova dumka, 2008. – 544 s.
12. *Hanzen-Lyove Oge A.* Intermedial'nost' v russkoj kul'ture: ot simvolizma k avangardu / Oge A. Hanzen-Lyove ; [per. s nem. B. M. Skuratova, E. Yu. Smotrickogo]. – M. : Ros. gos. gum. un-t, 2016. – 450 s .
13. WordPress : [bibliographic database]. – [Lisbon], 2014. – URL: https://cursointermidialidade.wordpress.com/wp-content/uploads/2014/08/wolf.pdf ( data obrashcheniya: 24.09.2024).
14. *Haminova, A. A.* Teoriya intermedial'nosti v kontekste sovremennoj gumanitarnoj nauki / A. A. Haminova, N. N. Zil'berman // Vestnik Tomskogo gosudarstvennogo universiteta. – 2014. – № 389. – S. 38–45.
15. *Tishunina, N. V.* Metodologiya intermedial'nogo analiza v svete mezhdisciplinarnyh issledovanij / N. V Tishunina // Materialy mezhdunarodnoj nauchnoj konferencii, Sankt-Peterburg, 18 maya 2001 g. / S.-Peterb. gos. un-t ; redkol.: T. A. Dorohova (gl.red.) [i dr.]. – Sankt-Peterburg, 2001. – S. 149–154.
16. *Timashkov, A. Yu.* Intermedial'nost' kak avtorskaya strategiya v evropejskoj hudozhestvennoj kul'ture rubezha HIH – HH vekov: avtoref. dis. … kand. iskusstvoved.: 17.00.09 / Aleksej Yur'evich Timashkov ; S.-Peterb. gum. un-t prof-v. – Sankt-Peterburg, 2012. – 24 s.
17. *Garadnicki, Ya. A.* Litaratura yak mastactva: kamunikatyŭnasc', intermedyyal'nasc', naratyŭnasc' / Ya. A. Garadnicki // Belaruskaya navuka. – 2014. – S. 401.